**Пятушка, А.** Не забываюцца гады баявой маладосці / А. Пятушка // Браслаўская звязда. — 2014. — 26 ліп. — С. 1.

# НЕ ЗАБЫВАЮЦЦА ГАДЫ БАЯВОЙ МАЛАДОСЦІ

***На мінулым тыдні ў нашым раёне пачалося ўзнагароджанне ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане юбілейным медалём «У памяць 25-годдзя вываду войскаў з Афганістана». Першымі памятны медаль ва ўрачыстай абстаноўцы ў зале пасяджэнняў райвыканкама ваеннага камісара Віталя Грамніцкага атрымалі старшыня РГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Леанід Мікшта і воіны-інтэрнацыяналісты суддзя Аляксандр Сучок і старшыня ТВВАД Анатоль Міласердаў.***

Урачыстае ўзнагароджанне працягваецца, ваенкам і Мікшта з гэтай знамянальнай місіяй наведваюць былых «афганцаў» на іх месцах працы. Атрымаў памятны медаль і вадзіцель ДП «Браслаўкамунальнік» Леанард Рагоўскі. Пра тую вайну ў чужой краіне Леанард Часлававіч расказваць не любіць, хоць да сённяшняга дня ў памяці ўсплываюць цяжкія эпізоды баявой маладосці.

Павестку ў армію юнак атрымаў восенню 1982 года.

– Служыць хацелася далей ад дому, – успамінае юнацкае жаданне Л. Рагоўскі.

Але хто б мог падумаць, што яго мара здзейсніцца ў такой далёкай незнаёмай краіне.

Ужо ў цягніку, які накіроўваўся ў Ашхабад, маладыя прызыўнікі даведаліся пра небяспечнае месца сваёй службы. У вучэбцы на тэрыторыі Туркменскай ССР Леанард набыў навыкі ваенна-страявой падрыхтоўкі і атрымаў званне малодшага сяржанта. Праз паўгода новаспечаных байцоў даставілі на самалёце ў Кандагар, дзе малодшы сяржант Л. Рагоўскі быў прызначаны камандзірам аддзялення мотастралковых войскаў.

– Вакол бясконцыя горы, бясплодная пустыня і драбнюткі надакучлівы пясок, – узгадвае мясцовыя пейзажы Леанард Часлававіч. – Днём невыносная спёка, а ноччу і пры нуль градусаў мерзлі, як у сцюжу.

Пацягнуліся цяжкія баявыя дні службы – ачапленне і ахова аўтамабільных калон з гаручым, якія рухаліся з СССР, зачыстка кішлакоў. Паколькі аўтакалоны больш за ўсё цікавілі «духаў», то і ахова іх была складанай, але важнай задачай. З болем ў сэрцы ўспамінае «афганец» поўнае знішчэнне аўтакалоны, для трывалай аховы якой не хапіла часу падрыхтавацца.

Вялікае напружанне, увага і канцэнтрацыя ўсіх пачуццяў патрэбны былі і пры наведванні кішлакоў, дзе за кожным вуглом падсцерагала куля.

– З мясцовым насельніцтвам, – кажа Леанард Часлававіч, – адносіны былі складаныя. Ды і хто любіць чужых, ды яшчэ са зброяй.

Пасля года службы Л. Рагоўскаму прысвоілі званне сяржанта і назначылі намеснікам камандзіра стралковага ўзвода. Несумненна, гэта пашырыла і кола абавязкаў, і ўзмацніла адказнасць за падначаленых байцоў.

Тры разы давялося зведаць жах акружэння, калі сілы праціўніка перавышалі ў некалькі разоў. На шчасце, абыходзілася без страт, бо кожны раз на дапамогу паспявалі дэсантнікі.

Да, мякка кажучы, сціплых умоў таксама трэба было прызвычаіцца. Вялікія маскіровачныя палаткі, дзе ўсюды, як ні вычышчай, ляжаў слоем апрыкры пясок, выгоды на вуліцы, ваду дастаўлялі. Ды і прыстасаваная душавая асаблівага задавальнення і адчування поўнай чысціні не прыносіла.

Многія хлопцы хварэлі на розныя інфекцыйныя захворванні. Не абмінула і гэта доля і Леанарда. Яму паставілі дыягназ гепатыту і адправілі ў шпіталь на тэрыторыю Узбекістана. Але нездарма кажуць, што

ў медаля і два бакі. Менавіта хвароба стала падставай для радаснай сустрэчы з бацькамі, якія выправіліся ў далёкую дарогу, каб упэўніцца, што іх крывінка не паранена.

А потым зноў вайна...

Цэлы месяц ужо дэмабілізаваны Л. Рагоўскі прагна ўглядаўся ў неба, каб убачыць запаветны самалёт, які даставіць на родную зямлю.

Незаўважна прабег час, выраслі дачка і сын, пацішэў боль. Але гады баявой маладосці раз-пораз да дробязей усплываюць у памяці.

**Алена Пятушка**